СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КОМСАМОЛА БЕЛАРУСІ XVIII З'ЕЗДУ ЛКСМБ

Даклад сакратара ЦК ЛКСМ Беларусі тав. П. М. МАШЭРАВА

Таварышы!

У перыяд паміж XVII і XVIII з'ездамі комсамола Беларусі адбыліся падзеі велізарнага гістарычнага значэння. Знамянальным этапам у жыцці савецкага народа з'явіўся XIX з'езд Комуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пастанова вераснёўскага Пленума ЦК КПСС і наступныя рашэнні партыі і ўрада з'явіліся баявой праграмай крутога ўздыму ўсіх галін сельскай гаспадаркі, павышэння матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню ўсіх савецкіх людзей. Гэтыя рашэнні натхнілі комсамольцаў і моладзь рэспублікі на новыя працоўныя справы.

Наша моладзь, як і ўвесь савецкі народ, адчувае бязмежнае давер'е і прасякнута гарачай любоўю да сваёй роднай Комуністычнай партыі. Комсамол Беларусі, уся моладзь нашай рэспублікі няўхільна прытрымліваюцца палітыкі Комуністычнай партыі і Савецкага ўрада, якая забяспечвае далейшы росквіт нашай социялістычнай Радзімы.

Нядаўна адбыўся XXI з'езд Комуністычнай партыі Беларусі. З'езд абмеркаваў даклад сакратара ЦК КП Беларусі таварыша Патолічава Н. С. і намеціў разгорнутую праграму далейшага ўздыму народнай гаспадаркі, павышэння матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню працоўных Савецкай Беларусі. Рашэнні з'езда павінны быць пакладзены ў аснову ўсёй далейшай практычнай дзейнасці комсамола Беларусі.

Удзельнічаючы ў вырашэнні велізарных народнагаспадарчых і палітычных задач, комсамол рэспублікі пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі Беларусі прайшоў за справаздачны перыяд вялікую школу практычнай работы і ідэйнай загартоўкі, і, як адзін з баявых атрадаў ВЛКСМ, прыйшоў да свайго XVIII з'езда яшчэ больш вырасшым і ўзмацнелым, як ніколі згуртаваным вакол роднай Комуністычнай партыі, яе Цэнтральнага Камітэта і Савецкага ўрада. **(Апладысменты).**

Бязмежная любоў моладзі да Радзімы, партыі і народа знайшла сваё яркае выражэнне ў патрыятычным руху моладзі па асваенню цалінных земель. Комсамольцы і моладзь Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюза, горача адгукнуліся на заклік партыі. За некалькі дзён ад юнакоў і дзяўчат рэспублікі паступіла звыш 5,5 тысячы заяў з просьбай паслаць іх на асваенне новых земель у раёны Сібіры, Казахстана, Урала, Паволжжа. Заявы працягваюць паступаць няспынным патокам. У бліжайшыя дні першыя атрады беларускіх энтузіястаў адправяцца ў шлях.

Пленум ЦК КПСС, які адбыўся днямі, паставіў вялікія і адказныя задачы ў справе далейшага павелічэння вытворчасці збожжа ў краіне і асваення цалінных і абложных земель.

Ад імя з'езда, усёй моладзі мы запэўніваем Цэнтральны Камітэт партыі, што юнакі і дзяўчаты Савецкай Беларусі ўнясуць свой дастойны ўклад у гэтую вялікую агульнанародную справу асваення цалінных і абложных земель. **(Апладысменты).**

II.

Уздел комсамольцаў, усёй моладзі рэспублікі ў барацьбе за далейшае развіццё сельскай гаспадаркі з'яўляецца самай надзённай і баявой задачай комсамола Беларусі.

Цяперашні XVIII з'езд ЛКСМБ павінен з'явіцца з'ездам мабілізацыі сіл моладзі рэспублікі на выкананне задач, пастаўленых партыяй па крутому ўздыму сельскай гаспадаркі, далейшаму росту матэрыяльнага дабрабыту нашага народа.

Выконваючы пастанову вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, комсамольскія арганізацыі рэспублікі сталі больш актыўна ўдзельнічаць у гаспадарчай дзейнасці калгасаў, МТС і саўгасаў. Комсамол Беларусі пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі Беларусі правёў паўную арганізатарскую і палітычную работу сярод моладзі па мабілізацыі яе сіл на вырашэнне канкрэтных задач уздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Разам з тым трэба прызнаць, што ЦК, абкомы, райкомы ЛКСМБ, многія комсамольскія арганізацыі яшчэ слаба вядуць работу па ажыццяўленню рашэнняў вераснёўскага Пленума ЦК КПСС. У снежні 1953 года Цэнтральны Камітэт партыі Беларусі разгледзеў пытанне аб рабоце комсамольскіх арганізацый па выкананню пастановы вераснёўскага Пленума ЦК КПСС. ЦК КП Беларусі адзначыў, што комсамольскія арганізацыі не дабіліся карэннай перабудовы сваёй работы ў адпаведнасці з патрабаваннямі вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, слаба прыцягваюць сельскую моладзь да вырашэння задач павышэння культуры земляробства і прадукцыйнасці грамадскай жывёлагадоўлі, не прымаюць мер да правільнай расстаноўкі комсамольскіх сіл на рашаючых участках сельскагаспадарчай вытворчасці. Указанні ЦК КПБ павінны з'явіцца праграмай нашай практычнай работы па выкананню рашэнняў вераснёўскага Пленума ЦК КПСС.

Адным з галоўных пытанняў у рабоце комсамольскіх арганізацый з'яўляецца іх удзел у далейшым развіцці грамадскай жывёлагадоўлі.

ЦК ЛКСМ Беларусі паставіў задачу—рашучым чынам палепшыць работу комсамола па ўмацаванню кадраў жывёлаводаў з тым, каб на асноўных фермах у кожным калгасе працавала не менш 10—15 членаў ВЛКСМ.

Асобныя комсамольскія арганізацыі правільна вырашаюць гэтую задачу. Так, у Мірскім раёне (сакратар райкома комсамола тав. Баробка) для работы на жывёлагадоўчыя фермы пасля вераснёўскага Пленума ЦК КПСС накіравана 115 комсамольцаў, у большасці калгасаў працуе ў жывёлагадоўлі па 10 і больш комсамольцаў. У Магілёўскім раёне (сакратар райкома тав. Марозаў) на жывёлагадоўчых фермах працуе 285 членаў ВЛКСМ.

Аднак ЦК ЛКСМ Беларусі, абкомы, многія райкомы ЛКСМБ і комсамольскія арганізацыі дрэнна вядуць работу па накіраванню комсамольцаў на фермы. Пасля вераснёўскага Пленума паслана для работы ў жывёлагадоўлю ўсяго толькі каля 8 тысяч членаў ВЛКСМ. У сучасны момант на фермах працуе нямногім больш 17 тысяч комсамольцаў.

У Брэсцкай вобласці, напрыклад, пасля вераснёўскага Пленума ЦК КПСС паслана на фермы толькі 818 членаў ВЛКСМ, усяго працуе 1.319 комсамольцаў, у той час, як павінна было-б працаваць каля 7 тысяч.

Аналагічнае становішча ў Маладзечанскай-маладзёжных звенняў дае добрыя вынікі.

Але разам з тым многія комсамольскамаладзёжныя звенні, створаныя ў калгасах рэспублікі, распаліся. Слаба было арганізавана социялістычнае спаборніцтва сярод маладых ільнаводаў. У гэтым годзе да работы ў звенні трэба прыцягнуць дадаткова не менш 50 тысяч комсамольцаў і моладзі.

Партыя патрабуе рэзка падняць ураджайнасць усіх сельскагаспадарчых культур. Галоўнай умовай гэтага з'яўляецца ўмяшанне ў глебу найбольшай колькасці мясцовых угнаенняў — гною і торфу.

Рад комсамольскіх арганізацый, у тым ліку: абласныя—Брэсцкая, былыя Полацкая і Баранавіцкая, раённыя — Кармянская, Глыбоцкая, Мастоўская, Вілейская і іншыя, многія калгасныя арганізацыі дабіліся пэўных вынікаў у гэтай рабоце. Паспяхова мабілізуюць сілы комсамольцаў і моладзі на нарыхтоўку і вывазку торфу абком і райкомы комсамола Гродзенскай вобласці.

Нарыхтоўка і вывазка торфу на ўгнаенне ідзе ў гэтым годзе цекалькі лепш, чым у мінулым. Аднак комсамольскія арганізацыі рэспублікі яшчэ слаба ўдзельнічаюць у гэтай важнай справе.

Адной з самых адстаючых па ўраджайнасці абласцей з'яўляецца Віцебская. Але абком комсамола займаўся толькі папяровым дэклараваннем і размовамі аб карысці торфу і гною.

ЦК, абкомам, райкомам комсамола неабходна прыняць самыя энергічныя меры да выканання ўказання ЦК КП Беларусі аб прыцягненні ў пастаянныя брыгады і групы па нарыхтоўцы і вывазцы торфу не менш 25 тысяч комсамольцаў і моладзі, па 5—6 чалавек у кожным калгасе. У сучасны перыяд павінен быць забяспечан масавы ўдзел моладзі ў нарыхтоўцы і вывазцы мясцовых угнаенняў, трэба дабіцца, каб у кожным раёне штодзённа працавала не менш 1.500—2.000 юнакоў і дзяўчат.

Галоўнай, рашаючай роляй у далейшым развіцці сельскай гаспадаркі належыць машынна-трактарным станцыям.

Многія комсамольскія арганізацыі МТС аказваюць актыўную дапамогу партыйным арганізацыям. Удзельнікам МТС у барацьбе за высокапрадукцыйнае выкарыстанне трактараў і іншых сельскагаспадарчых машын, своечасовае і добраякаснае выкананне калаварных абавязацельстваў МТС з калгасамі.

Добрых поспехаў у рабоце дасягнула комсамольская арганізацыя Лунінецкай МТС. Маладзечанскай вобласці. Уся комсамольцы гэтай МТС выканалі гадавое заданне па ўсіх відах трактарных работ. 10 чалавек дабіліся яго выканання на 200 і больш працэнтаў.

Разам з тым у рабоце комсамольскіх арганізацый МТС маюць месца сур'ёзныя недахопы. Значная частка маладых механізатараў не выконвае зменных норм, дрэнна авалодвае тэхнікай, няпоўнасцю выкарыстоўвае яе.

Комсамольскім органам прадстаіць правесці вялікую работу па карэннаму паляпшэнню кіраўніцтва комсамольскімі арганізацыямі МТС. Комсамольскія арганізацыі МТС павінны выступаць ініцыятарамі і арганізатарамі социялістычнага спаборніцтва за павышэнне прадукцыйнасці кожнай машыны, за выпрацоўку на кожны трактар не менш 500 гектараў. Неабходна шырока разгарнуць рух сярод механізатараў за авалодванне сумежнымі прафесіямі, настойліва дабівацца, каб кожны малады механізатар у дасканаласці ведаў тэхніку.

У сучасны момант важнейшай задачай маладых механізатараў з'яўляецца актыўны ўдзел у падрыхтоўцы парку МТС да веснавой сяўбы, своечасовым і высокаякасным выкананні ўсіх сельскагаспадарчых работ.

Важным сродкам павышэння культуры земляробства і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі з'яўляецца ўкараненне агра-зоатэхнічнай навукі і перадавога вопыту. Амаль у кожным калгасе рэспублікі ёсць аграномы і зоатэхнікі. Гэта дазваляе значна паляпшыць справу агра-зоатэхнічнай вучобы моладзі. Аднак навучальны год у большасці калгасаў пачаўся неарганізавана, з вялікім спазненнем. План набору слухачоў на курсы па многіх абласцях не выкананы. Асабліва нездавальняюча арганізавана работа агра-зоатэхнічных курсаў у Мінскай і Гомельскай абласцях.

Задача заключаецца ў тым, каб разам з сельскагаспадарчымі органамі палепшыць агра-зоатэхнічную моладзі, ухіліць фармалізм у гэтай справе.

Паспяховае вырашэнне задач, якія стаяць перад комсамолам рэспублікі ў сувязі з пастановай вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, патрабуе сур'ёзнага арганізацыйнага ўмацавання комсамольскіх арганізацый калгасаў і МТС. Нельга лічыць нармальным, калі ў калгасах рэспублікі працуе ўсяго толькі 110 тысяч членаў ВЛКСМ.

ЦК КП Беларусі патрабаваў павялічыць колькасць комсамольцаў на сяле як за лік росту сельскіх комсамольскіх арганізацый, так і за лік пасылкі комсамольцаў з гарадоў і раённых цэнтраў для работы ў калгасы і МТС.

прамысловасці, будоўляў і транспарту значна актывізавалі шэфскую дапамогу калгасам, МТС і саўгасам. Многія комсамольскія арганізацыі Мінска, Віцебска і іншых гарадоў праводзяць значную работу ў гэтым напрамку. Комсамольцы і маладыя рабочыя прадпрыемстваў сельскагаспадарчага машынабудавання і іншых прадпрыемстваў, выконваючых заказы для сельскай гаспадаркі, уключыліся ў социялістычнае спаборніцтва за паспяховае іх выкананне, актыўна ўдзельнічаюць на ўдасканаленні і стварэнні новых сельскагаспадарчых машын.

Аднак рад гаркомаў, райкомаў ЛКСМБ, комсамольскіх арганізацый гарадоў не дабіўся карэннай перабудовы шэфскай работы ў адпаведнасці з патрабаваннямі вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, звёў яе ў асноўным да складання розных абавязацельстваў і рашэнняў.

Задача комсамольскіх арганізацый прамысловасці заключаецца ў тым, каб шырока разгарнуць социялістычнае спаборніцтва за паспяховае выкананне заказаў для сельскай гаспадаркі, забеспячэнне МТС запаснымі часткамі для трактараў і іншых сельскагаспадарчых машын.

Трэба ўзмацніць увагу да дзейнасці комсамольскіх арганізацый прадпрыемстваў, якія выконваюць заказы сельскай гаспадаркі, і, у першую чаргу, мінскіх трактарнага і аўтамабільнага заводаў, завода «Гомсельмаш».

Справаздачны перыяд характарызуецца значным павышэннем актыўнасці комсамольскіх арганізацый у вытворча-гаспадарчай дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў. Каля 120 тысяч комсамольцаў і маладых рабочых прамысловасці, будоўляў, транспарту і арцелей з'яўляюцца перадавікамі спаборніцтва, датэрмінова завяршылі выкананне сваіх гадавых норм. Больш 25 тысячы маладых рабочых выканалі пяцігадовыя планы.

Пры актыўным удзеле комсамольцаў і моладзі даржаўны план 1953 года прамысловасці рэспублікі выкананы на 103 працэнты. Вырабляна валавой прадукцыі за 1953 год на 6 мільярдаў 300 тысяч рублёў больш, чым у 1950 годзе.

Многія комсамольскія арганізацыі прадпрыемстваў прамысловасці, таварнай прамысловай кааперацыі з'яўляюцца ініцыятарамі спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў работы, за ўзорны парадак на рабочым месцы, за эканомію сыравіны, матэрыялаў, паліва, за ашчадлівае адносіны да грамадскай маёмасці, за ўзорнае выкананне вытворчых заданняў. Прыкладам гэтага можа служыць работа комсамольскіх арганізацый мінскай кандытарскай фабрыкі імя Куйбышава, Мінскага тонкасуконнага камбіната, шкларазвода «Нёман», фабрыкі «КІМ», дыванова-ткацкага камбіната і цэлага раду іншых.

Аднак узровень работы многіх комсамольскіх арганізацый на ўдзелу іх у вытворча-гаспадарчай дзейнасці не адпавядае сучасным патрабаванням.

Абавязак комсамольскіх арганізацый прадпрыемстваў прамысловасці таварaў народнага спажывання — няспынна эмацаца за ажыццяўленне мерапрыемстваў Комуністычнай партыі і Савецкага ўрада па крутому ўздыму вытворчасці прадметаў народнага спажывання.

Перад комсамольскімі арганізацыямі будаўніцтва і прадпрыемстваў будоўнічых матэрыялаў стаяць вялікія задачы па мабілізацыі сіл моладзі на паскарэнне тэмпаў будаўніцтва, паляпшэнне якасці і зніжэнне кошту будаўнічых работ.

Многія комсамольскія арганізацыі дапускаюць сур'ёзныя недахопы ў арганізацыі социялістычнага спаборніцтва. Нярэдка работа па ўцягненню моладзі ў спаборніцтва вядзецца фармальна, без уліку канкрэтных задач, якія стаяць перад прадпрыемствам.

Комсамольскія арганізацыі закліканы забяспечыць актыўны ўдзел у социялістычным спаборніцтве ўсёй рабочай моладзі, ухіліць фармалізм у гэтай справе, забяспечыць дзейсны кантроль і практычную дапамогу ў выкананні социялістычных абавязацельстваў.

Трэба і надалей падымаць моладзь на барацьбу за найстражэйшы рэжым эканоміі, паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі, усямерна ўмацоўваць свядомую працоўную дысцыпліну, дабівацца няўхільнага павышэння прадукцыйнасці працы маладых рабочых.

У павышэнні прадукцыйнасці працы важнае значэнне мае вытворча-тэхнічнае навучанне маладых рабочых. Нажаль яно на большасці прадпрыемстваў у сучасны момант наладжана слаба.

Патрабуецца палепшыць работу па падрыхтоўцы маладых рабочых у сістэме прафесіянальнай адукацыі.

У сучасны момант у рэспубліцы працуюць 41 раменае і чыгуначнае вучылішчы і школы ФЗН і 41 вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, у якіх займаецца больш 22 тысяч навучэнцаў. Работа комсамольскіх арганізацый працоўных рэзерваў у справаздачны перыяд значна палепшылася, стала больш жывой і змястоўнай. Комсамольская праслойка па вучылішчах і школах ФЗН рэспублікі складае звыш 70 працэнтаў. Павысілася паспяховасць навучэнцаў.

Аднак у рабоце комсамольскіх арганізацый працоўных рэзерваў, асабліва ў вучылішчах і школах ФЗН, яшчэ многа недахопаў. Не ўсе комсамольскія арганізацыі ўмацавалі сваю работу сярод моладзі, якая вучыцца. Не ўсюды ўдзелена належная ўвага ідэйна-палітычнаму выхаванню моладзі, фарміраванню ў яе комуністычнага светапогляду. Не ўсе комсамольскія арганізацыі ўмацавалі